Дзяшук, ён жа і ўзначаліў маладзёжнае брацтва, надаўшы яму новае развіццё. На працягу 2 гадоў нёс сваё дыяканскае служэнне тут айцец Іаан Аўсіевіч. З кастрычніка 2010г. сваё служэнне на прыходзе храма Сабора Усіх Беларускіх Святых пачаў дыякан Павел Церашкоў.



Цяпер ідзе актыўная падрыхтоўка да асвячэння храма, якое адбудзецца 7 лістапада гэтага года, адбудзецца падзея, якую з нецярпеннем чакаюць усе вернікі не толькі прыхода, але і ўсяго горада.

«Да гэтага мы імкнуліся, але мы не збіраемся на гэтым спыняцца. Ёсць яшчэ шмат праектаў і ідэй, якія мы хочам увасобіць у жыццё», - адзначае айцец Анатоль.

Храм у гонар Сабора Усіх Беларускіх Святых яшчэ не мае векавой гісторыі, яго гісторыя - крыху больш за дзесяцігоддзе, але гэта гісторыя планаў і здзяйсненняў, перажыванняў і радасных момантаў, надзей і Божай дапамогі. А галоўнае, гэта гісторыя беларускага народа, які пабудаваў праваслаўны храм для сваіх унукаў і праўнукаў. На заклік – “Пабудуем Царкву разам!” – адгукнуліся многія вернікі, і галоўная мэта – будаўніцтва храма – ажыццявілася. А таму мы з упэўненнасцю можам сказаць – мы “Пабудавалі царкву разам!”

7 лістапада 2011г. мы зможам разам з усімі праваслаўнымі вернікамі горада Гродна адчуць радасць, радасць асвячэння яшчэ адной святыні беларускай зямлі. 7 лістапада мы саборна ўзнясём свае малітвы нябесным заступнікам нашай зямлі: «Усе святыя зямлі беларускай, маліце Бога за нас».

Юлія ШТАЛІКАВА

Протаіерэй Аляксандр Коўш: вяртанне з забыцця

У міжваеннай Вільне імя Аляксандра Каўша было вядома бадай кожнаму праваслаўнаму беларусу. Але сёння яно рэдка сустракаецца нават у гістарычных творах і даследаваннях. Жыццё гэтага чалавека, у якім цудоўным чынам пераплячіся палітыка і вера, грошы і турма, патрыятызм і хрысціянства, магло ўжо даўно стаць сюжэтам для якога-небудзь рамана ці кінафільма. Забіты ў часы вайны, святар не пакінуў нам мемуараў ды шматтомных разважанняў, але ён пакінуў нам напамін, што лёс беларускага пастыра ў ХХ стагоддзі – гэта лёс пакутаў і ахвяраў. І вось прыйшоў час у поўнай меры прасачыць гэты лёс і прыадчыніць яшчэ адну старонку гісторыі Праваслаўнай Царквы на Беларусі, якая так доўга была зачынена замком часу.

Будучы святар нарадзіўся 2 жніўня 1884г. у вёсцы Верцялішкі (па іншых звестках у весцы Рыдзялі Верцялішскай воласці) Гродзенскага павета ў праваслаўнай сялянскай сям’і. Усяго сям’я Коўш мела дзесяць дзяцей, але многія з іх памерлі яшчэ ў дзяцінстве. Гэты лёс мог напаткаць і маленькага Аляксандра – маці ўжо рыхтавалася яго пахаваць – але смерць на гэты раз абмінула іх дом. Хлопчык вырас і пражыў доўгае і бурлівае жыццё.

Пасля заканчэння мясцовай школы настаўнікі накіравалі Аляксандра, як даволі здольнага і добрасумленнага юнака, на навучанне ў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю. Скончыўшы семінарыю ў 1904г., ён, кажучы сучаснай мовай, быў “размеркаваны” настаўнікам у мястэчка Дамачава Брэсцкага павета (некаторыя біёграфы Каўша сцвярджаюць, што ён працаваў настаўнікам на Століншчыне, што падаецца нам памылковым). Адпрацаваўшы абавязковыя чатыры гады ў мясцовым народным вучылішчы, ён вырашыў пакінуць гэтыя мясціны і пераехаць у Люблін. Магчыма на такое рашэнне маглі паўплываць цяжкія матэрыяльныя ўмовы, якія адчуваў малады настаўнік у пачатку сваёй кар’еры. У Любліне Аляксандр скончыў бухгалтарскія курсы і ўладкаваўся ў аддзяленні Рускага дзяржаўнага банку на пасаду канцылярскага чыноўніка (праз тры гады ён ужо стаў рахунковым чыноўнікам другога разраду). Напачатку Першай сусветнай вайны банкаўскае аддзяленне разам з усімі супрацоўнікамі было эвакуіравана ўглыб Расіі. Аляксандр Коўш першапачаткова жыў у Маскве, потым у Разані, Славянску, Майкопе. Але Радзіма клікала свайго сына назад. Пасля цяжкага бежанскага жыцця і ўсіх рэвалюцыйных ліхалеццяў ён вырашае вярнуцца дамоў, на Гродзеншчыну, якая ў гэтыя часы ўжо стала, паводле Рыжскага мірнага дагавора, часткай тэрыторыі т. зв. “Другой Рэчы Паспалітай”. Менавіта ў Гродне адбудзецца фактычна яго другое нараджэнне, нараджэнне ў якасці святара.

Рашэнне прыняць духоўны сан і звязаць сваё жыццё з Богам А.Коўш, магчыма, прыняў падчас знаходжання ў эвакуацыі. Маральная дэградацыя і духоўны секулярызм, якія панавалі ў расійскім грамадстве часоў рэвалюцыі, прымушалі многіх бачыць у Царкве і хрысціянстве апошні паратунак. Асабліва гэта датычылася інтэлігенцыі, той праслойкі грамадства, якая першапачаткова згубіла

Хрыста дзеля моднага матэрыялізму, але потым, насыціўшыся рэвалюцыйнымі “свабодамі”, зноў пачалі вяртацца да хрысціянскага светапогляду, зноў шукаць выйсця з вялізарнай духоўнай ямы, у якую самі, не жадаючы гэтага, трапілі. Некаторыя прымалі святарства, каб канчаткова парваць з былымі ідэямі і перакананнямі. Так, напрыклад, у 1918г. святаром стаў вядомы расійскі філосаф і эканаміст Сяргей Булгакаў. Такі ж самы лёс абраў для сябе і Аляксандр Коўш. У 1921г. епіскапам Гродзенскім Уладзімірам (Ціханіцкім) ён быў рукапаложаны ў сан праваслаўнага святара. З гэтай хвіліны і да самога свайго канца айцец Аляксандр будзе добрасумленна і самаахвярна служыць Богу і свайму народу.

Амаль усё пастырскае служэнне протаіерэя Аляксандра прыпадае на 1920 – 1930-я гг., калі Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад Польскай дзяржавы. Гэта былі даволі цяжкія часы для праваслаўных. Улады краіны надавалі вялікую ўвагу развіццю рыма-каталіцкага касцёла, які фактычна меў статус пануючага веравызнання. Праваслаўная царква ж апынулася ў становішчы канфесійнай меншасці. Пры гэтым польскія духоўныя і свецкія ўлады паступова звужалі сферу ўплыву праваслаўя, пераследвалі духавенства, што нярэдка прыводзіла да канфлікту не толькі на рэлігійнай, але і на этнічнай глебе. З пачатку 1920-х гг. у праваслаўных рэгіёнах Польшчы пачалі праводзіцца акцыі рэвіндыкацыі, г. зн. перадачы касцёлу культавых будынкаў і іншай рухомай і нерухомай маёмасці, што раней належала ўніятам і каталікам, але была перададзена былым царскім урадам Праваслаўнай Царкве. За ўвесь міжваенны час у каталіцкія касцёлы было пераўтворана прыблізна 1300 храмаў праваслаўных. Вельмі частымі былі выпадкі, калі адабраныя цэрквы зачыняліся і доўгі час пуставалі, бо ў праваслаўных мясцовасцях наўпрост не было патрэбнай колькасці прыхаджан-католікаў. Акрамя гэтага, улады здзяйснялі палітыку “рэдукцыі” – штучнага змяншэння лічбы праваслаўных прыходаў. Згодна з гэтым, прыход мог існаваць толькі тады, калі ён налічваў не менш 3 тысяч вернікаў, у адваротным выпадку яго зачынялі (для параўнання каталіцкая парафія магла існаваць нават пры наяўнасці 500 парафіян).

Нялёгка жылося ў міжваеннай Польшчы і праваслаўным святарам. Ужо той факт, што духавенству было цяжка атрымаць польскае грамадзянства, адлюстроўвае яго няроўнае і цяжкае становішча. Ня маючы пашпарту, многія святары былі дэпартаваны польскімі уладамі ў СССР, дзе яны пасля сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій. Вядомы беларускі палітык В.Рагуля ў сваіх успамінах прыгадваў, што “...ў жыцці на праваслаўных святароў глядзелі з падазрэннем, а часамі і з нянавісцю. Праваслаўны святар быў пад строгім наглядам каменданта паліцэйскага пастарунку...”. Духавества ўсё часцей пачало далучацца да нацыянальнага руху ўкраінцаў і беларусаў, каб хоць нейкім чынам абараніць свае правы і правы сваіх прыхаджанаў.

Польскі ўрад таксама вырашыў усталяваць і лаяльную да сябе структуру кіраўніцтва Праваслаўнай Царквы. 14 чэрвеня 1922г. на саборы епіскапаў у Варшаве мітрапаліт Георгій абвясціў аб стварэнні Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Супраць гэтага адразу выступілі кіраўнікі ўсіх трох заходнебеларускіх епархій (Віленскай, Гродзенскай і Пінскай), а таксама многія багасловы і царкоўныя дзеячы. Яны патрабавалі вырашыць пытанне аўтакефаліі кананічным шляхам на царкоўным саборы. Але да сярэдзіны 1924г. амаль усе нязгодныя іерархі страцілі свае пасады і былі вымушаны пераехаць за мяжу. У тым жа 1924г. канстанцінопальскі патрыярх пацвердзіў аўтакефалію Праваслаўнай Царквы ў Польшчы (хадзілі чуткі, што яго згода каштавала польскаму ўраду 30 000 франкаў). З гэтага часу Царква паступова палітызавалася, улады пачалі актыўна выкарыстоўваць яе ў якасці сродка асіміляцыі няпольскага славянскага насельніцтва краіны.

Ва ўмовах глыбокага крызісу праваслаўя ў Польшчы частка святароў, грунтуючыся на прынцыпе саборнасці, вырашыла наблізіць Царкву да патрэбаў і жаданняў простага народа. Не звяртаючы ўвагу на сваркі ў пакоях мітрапалітаў і епіскапаў, гэтыя святары імкнуліся працягнуць духоўнае выхаванне сваёй паствы хрысціянскім ідэалам і дапамагчы народу ў яго гаротным становішчы. У іх кагорце быў і протаіерэй Аляксандр Коўш. Яго першым месцам службы быў прыход у в.Дзятлавічы Ваўкавыскага павету. Тут ён упершыню сутыкнуўся з усімі цяжкасцямі праваслаўных беларусаў. Таму ў сваіх казаннях святар заклікаў сялянаў змагацца за свае правы, не забываць родную мову, адчыняць беларускія школы і супрацьстаяць пранікненням паланізацыі. Святар у гэты час таксама пазнаёміўся з некаторымі дзеячамі беларускага руху. У госці да яго прыязджалі беларускія соймавыя паслы П.Мятла і П.Валошын, а вядомы беларускі сенатар і абаронца праваслаўя В.Багдановіч чытаў у мясцовай царкве “Апостала” па-беларуску. Знаёмства з беларускімі палітыкамі прадвызначыла далейшы лёс святара. Калі ў 1925г. у Вільне пачаў ствараццa Беларускі кааператыўны банк, айцу Аляксандру, як спецыялісту ў банкаўскай сферы, была прапанавана пасада бухгалтара. Беларускі рух меў тады даволі абмежаваную колькасць вопытных фінансавых работнікаў, і таму Коўш прыняў гэтую прапанову, нягледзячы на свой духоўны статус. Але пры гэтым ён не пакідаў царкоўнага служэння: яму быў перададзены занядбаны прыход у віленскім прадмесці Сніпішкі, дзе ён за некалькі месяцаў аднавіў і адрэмантаваў прыхадскі храм, які падчас Першай сусветнай вайны быў ператвораны ў

электрычную станцыю. Акрамя гэтага айцец Аляксандр з 1926г. пачаў выкладаць Закон Божы для навучэнцаў Віленскай беларускай гімназіі. У Вільне ён стаў адным са стваральнікаў Беларускага Дабрадзейнага таварыства, якое займалася матэрыяльнай апекай незаможных і абяздоленых, а таксама з'яўляўся адным з заснавальнікаў прафесійнага Саюза беларускіх настаўнікаў.

Праца ў Беларускім кааператыўным банку вымагала збліжэння з дзеячамі легендарнай "стотысячнай" Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Ужо ні для каго не сакрэт, што менавіта праз гэты банк БСРГ атрымлівала грашовыя сродкі для сваёй дзейнасці з усходу. Некаторыя лідары гэтай беларускай партыі былі ў адзін час і сябрамі камуністычных арганізацый, напрыклад Б.Тарашкевіч, П.Валошын, Р.Астроўскі і інш. Зараз цяжка сказаць, якую ролю ў БСРГ адыгрываў святар Аляксандр Коўш, дый увогуле ці быў ён сябрам гэтай партыі. Службоўца II аддзелу Генеральнага штабу польскага войска ў "Кароткім нарысе беларускага пытання" выказвае даволі супярэчлівыя думкі наконт гэтага: "Што датычыць рэлігійных справаў, то... Грамада імкнулася выкарыстаць Царкву ў сваіх мэтах. Прыхільнікі Царквы выказваліся супраць аўтакефаліі праваслаўя ў Польшчы і імкнуліся да стварэння г. зв. Жывой царквы, інструменту бальшавікоў. У гэтай справе адкрыта дзейнічаў сенатар Аляксандр Уласаў, а патаемна – поп Аляксандр Коўш, камуніст. Ён быў адначасова адным з дырэктараў (дырэктарам банка быў Р.Астроўскі – А.Г.) і скарбнікам Беларускага кааператыўнага банка ў Вільні, дзякуючы чаму меў вырашальны ўплыў на падзел крэдытаў для асобных беларускіх арганізацый. Коўш меў вельмі шырокія кантакты з праваслаўным святарствам на правінцыі і, такім чынам, быў значнай для БСРГ асобай". Але, здаецца, польская выведка валодала нязначнай і спрэчнай інфармацыяй на гэты конт і таму трохі падмалявала асобу А.Каўша, зрабіўшы з яго камуніста ды абнаўленца. Наўрад ці праваслаўны святар быў актывістам бязбожнай кампартыі. Забягаючы наперад, зазначым, што ў 1939г., пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР, бальшавікі арыштоўвалі многіх былых дзеячаў КПЗБ і КПП як шпіёнаў і трацкістаў, але Аляксандр Коўш застаўся на свабодзе. А вось яго сувязі з сенатарам Уласавым хутчэй за ўсё мелі месца ў рэальнасці. Апошні ў сярэдзіне 1920-х гг. наладзіў трывалыя кантакты з метадысцкай царквой, якая прафінансавала некаторыя праекты беларускага руху, у тым ліку і БСРГ. Верагодна, пры дапамозе Уласава Коўш пазнаёміўся з некаторымі метадыстамі і згадзіўся прыняць удзел, разам з А.Луцкевічам і Р.Астроўскім, у перакладзе Бібліі на беларускую мову. Магчыма, частка перакладу вядомага гельсінфорскага беларускамоўнага выдання Новага Запавету 1931г. належыць як раз такі пяру айца Аляксандра.

У студзені 1927г. па ўсёй Заходняй Беларусі адбыліся арышты прыхільнікаў Грамады. Аляксандр Коўш, як галоўны бухгалтар банку, непасрэдна звязаны з "грашыма для партыі" таксама быў арыштаваны. Некаторы час сядзеў у віленскай турме Лукішкі. Затым разам з астатнімі дзеячамі БСРГ быў этапіраваны ўглыб Польшчы – у турму Вронкі. У вагоне цягніка разам са святаром аказаўся вядомы беларускі палітык Сымон Рак-Міхайлоўскі. У сваім "Турэмным дзённіку" ён пакінуў цікавыя запісы пра этап у Вронкі ды пра А.Каўша: "Сумна. Дзялюся ўкрадкай і адрывачна сваімі домысламі з Коўшам. Той – зусім дрэнна настроены, упаў духам. Пачынаю разважаць яго (а пры гэтым і сябе!), што пабаяцца публічнае апініі..., праз дні 2-3 ужо будзе ў газэтах, куды нас вывезлі... "А можа нас амністуюць?!" – шэпча збялелымі губамі ўвесь час бледны ўсё Коўш. Смяюся я. Новае пытанне Коўша шэптам: "А можа нас вязуць куды-небудзь у глуш, каб расстраляць?". – Ды кіньце Вы чорныя думкі!" – урэшце голасна ўжо кажу яму я. Азіраецца паліцыянт і напамінае, што трэба маўчаць... Пачынаю снедаць. На мігі прапаную Коўшу гарбату і закуску. Адмаўляецца, ня можа есці. Сядзіць замыслёны". Жах апанаваў святара перад таямнічай невядомасцю. Але страх быў гэты дарэмны – у сакавіку 1927г. Каўша вызваляюць пад заклад да прыгавора суда. Ён вяртаецца ў Вільню, дзе і працягне сваю грамадска-царкоўную справу.

У Вільне вызвалены святар даведаецца, што епіскап Феадосій пазбавіў яго прыхода ды ўвогуле забараніў адпраўляць усе літургічныя службы. Засталося толькі месца настаўніка ў беларускай гімназіі. У гэты час А.Коўш збліжаецца з групай В.Багдановіча, якая выступае супраць палітызацыі царквы і аўтакефаліі. У выдаваемым Багдановічам часопісе "Праваслаўная Беларусь" ён пад псеўданімам "Вукол" змяшчае артыкулы пра кааперацыю, у якіх падкрэслівае вялікае значэнне апошняй у грамадскім і эканамічным жыцці. Але супрацоўніцтва з Багдановічам было нядоўгім. У пачатку 1928г. варшаўскі мітрапаліт Дыянісій, каб прыняць удзел у парламенцкіх выбарах, пры дапамозе польскіх уладаў стварае "Праваслаўнае дэмакратычнае аб'яднанне" з мэтай адцягнуць частку галасоў ад несупыннага Багдановіча ды іншых беларускіх арганізацый. У шэрагах гэтага аб'яднання мы сустракаем прозвішча і протаіерэя Аляксандра. Ён нават стаў рэдактарам першага і апошняга нумару часопіса "Народная ніва", які выдавала варшаўская кансісторыя з разліку на выбары адразу на трох мовах. Набліжаўся суд над Грамадой, і, магчыма, жах турмы зноў пераадолеў айца Аляксандра, што прымусіла яго зрабіць крок насустрач лаяльным праўрадавым групоўкам. На судзе, які адбыўся ў лютым 1928г., з Каўша былі

зняты ўсе абвінавачванні. Дарэчы ў яго абарону выступаў усё той жа Вячаслаў Багдановіч, які, нягледзячы на ідэйныя разыходжанні, вельмі добра адклікаўся аб святары і падкрэсліваў, што ведае яго як чалавека "дзельнага, працавітага і беражлівага".

Пасля суда протаіерэй Аляксандр працягнуў сваю культурную і царкоўную працу з новым імпэтам. Са згоды віленскага духавенства ён час ад часу служыць набажэнствы для беларускіх гімназістаў у напаўразбуранай Пятніцкай царкве – самай старажытнай праваслаўнай святыне горада Вільна, пабудаванай яшчэ ў XIV ст. вялікай княжной Марыяй Яраславаўнай, жонкай Альгерда. Дзякуючы стараннем Каўша, храм быў адноўлены і на некалькі гадоў стаў фактычна адзіным месцам ва ўсёй Польшчы, дзе можна было пачуць беларускамоўную службу і казанні. Але ў міжваенны час Пятніцкая царква не мела ўласнага прыхода і была прыпісана да Мікалаеўскай царквы, якая размяшчалася непадалёк. Айцец Аляксандр пачынае выступаць за тое, каб беларусы мелі ў Вільна свой паўнавартасны прыход з храмам. Улетку 1928г. ён разам з Р.Астроўскім, тагачасным дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі, звярнуліся да мітрапаліта Дыянісія з просьбаю наконт асобнага беларускага прыхода. Мітрапаліт даў дазвол епархіяльным уладам на яго стварэнне, але віленскі архіепіскап Феадосій паставіўся да гэтага даволі скептычна. Ён, не жадаючы абвяшчаць адзін з пяці віленскіх прыходаў як беларускі, прапанаваў заснаваць прыход пры Пятніцкай царкве. Але на гэта трэба было атрымаць дазвол польскага міністэрства веравызнанняў і публічнай асветы. Дасланае ў міністэрства прашэнне згубілася ў бюракратычнай руціне і справа з беларускім прыходам замарудзілася. Была спроба ўзнавіць яе ў 1929г., але ні Коўш, ні Астроўскі не змаглі дасягнуць пастаўленнай мэты.

У гэтыя часы айцец Аляксандр таксама пачаў актыўна займацца выдавецкай і асветніцкай працай. У канцы 1920-х гг. уся праваслаўная грамадскасць Польшчы чакала царкоўнага Сабора, на якім планавалася канчаткова вырашыць ўсе злабадзённыя праблемы Царквы. Гэта падштурхнула многіх праваслаўных дзеячоў актывізаваць сваю дзейнасць, каб паспець выказаць уласны пункт гледжання па царкоўным пытанням. З 1 верасня 1928г. пад рэдакцыяй айца Аляксандра пачаў выходзіць "царкоўна-народны" двухтыднёвік "Беларуская зарніца". "Праваслаўная Царква, як і кожная іншая, не павінна служыць матэрыялам для палітычных і партыйных эксперыментаў, – пісаў святар у сваім першым праграмным артыкуле. – Справа ўпарадкавання Праваслаўнай Царквы з`яўляецца правам выключна саборнага розуму і нашага праваслаўнага сумлення". Закранаючы праблему беларусізацыі Царквы, айцец Аляксандр падкрэсліваў, што царкоўна-славянская мова павінна застацца мовай багаслужэнняў, а казанні ды выкладанне ў школах Закону Божага неаходна праводзіць па-беларуску. У часопісе акрамя ўласных артыкулаў А.Каўша таксама змяшчаліся нарысы, прысвечаныя гісторыі Царквы, павучальныя апавяданні для моладзі, афіцыйныя дакументы мітраполіі і пераклады (напрыклад, на беларускую мову быў перакладзены твор М.Бярдзяева "Царства Божае і царства кесара"). Усяго выйшла 13 нумароў "Беларускай зарніцы". У маі 1929г. часопіс, верагодна з-за фінансавых цяжкасцяў, перастаў выдавацца, пакінуўшы значны след у заходнебеларускім культурным жыцці як трэцяе беларускамоўнае праваслаўнае выданне.

У 1930г. айцец Аляксандр стаў віцэ-старшынёй Цэнтральнага беларускага праваслаўнага камітэта, мэтай якога было аб'яднаць намаганні праваслаўных беларусаў у барацьбе супраць паланізацыі і амаралізацыі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Але праца ў камітэце і сяброўства з яго кіраўніком Ф.Вернікоўскім шмат чым каштавалі святару. Ён пачаў паступова аддаляцца ад свайго сябра Р.Астроўскага, і той адразу пераўтварыўся ў яго заклятага ворага. Былы дзеяч Грамады ды дырэктар кааператыўнага банку Астроўскі стаў цяпер лаяльным паланафілам і ў сваім часопісе "Голас праваслаўнага беларуса" імкнуўся ўсялякім чынам дыскрэдытаваць былога калегу. Існуе версія, што карані гэтага канфлікту ўзыходзілі яшчэ да часоў іх сумеснай працы ў банку. Коўш, як галоўны бухгалтар, хутчэй за ўсё ведаў пра пэўныя махінацыі Астроўскага з грашовымі сродкамі. Апошні ж, магчыма, баяўся, што святар, пазбавіўшыся яго кантролю, у вызначаны момант перастане маўчаць, таму з дапамогай паклёпаў ды сваіх сувязяў у епархіі спрабаваў адсунуць айца Аляксандра далей ад Вільні. Коўш быў пазбаўлены пасады законанастаўніка беларускай гімназіі ды пераведзены святаром у Мікалаеўскую царкву. Але тут ён не паспеў нават адслужыць першую літургію. У "Голасе праваслаўнага беларуса" было змешчана "Открытое письмо", у якім быццам бы "прихожане Виленской Свято-Николаевской церкви" абураліся новым прызначэннем Каўша. "Во избежание неприятностей и недоразумений... мы просим Вас не навязывать приходу Вашей особы, совершенно для него неприемлемой", – лямантавалі "вернікі". Айца Аляксандра вінавацілі ва ўсіх магчымых злачынствах, нават у тым, што ён сябруе з уніятамі і... голіць бараду (абвінавачанне ў сувязях з уніятамі было найбольш папулярным у Р.Астроўскага і яго прыхільнікаў). У рэшце рэшт у верасні 1932г. віленскія духоўныя ўлады перавялі гаротнага святара ў вёску Норыца (Ласіцы) Пастаўскага павета, дзе ён стаў настаяцелем мясцовай царквы. Фактычна гэта была ссылка. Тагачасная

праваслаўная газета “Царква і народ” паведамляла: “У дзень ад’езду на вакзале прадстаўнікі ад беларускіх праваслаўных арганізацый, моладзь і студэнтства шчыра развіталіся з любым пастырам, якога запэўнілі, што – вытрымаюць і перамогуць”. На сваім новым месцы службы айцец Аляксандр не мог займацца ані грамадскай, ані выдавецкай справай, але, як і раней, прамаўляў казанні па-беларуску і стварыў царкоўны хор, які спяваў беларускія духоўныя песні. Гэта прыйшло недаспадобы польскай адміністрацыі і ён у 1937г. быў вымушаны пераехаць у в.Кастыкі Вялейскага павета.

У Вільню айцец Аляксандр вернецца толькі ў канцы 1939г., калі гэты горад савецкімі ўладамі ўжо будзе перададзены Літве. Зноў пачне служыць у Мікалаеўскай царкве, каля яе будзе і жыць, у кватэры настаяцеля Бяляева. У 1940 – 1941 гг., ужо ў савецкай Літве, ён уладкуецца на пасаду галоўнага бухгалтара Літоўскага дзяржаўнага банка, разам з вядомым ксяндзом Адамам Станкевічам будзе кіраваць беларускай секцыяй Чырвонага Крыжа. Што датычыцца апошніх гадоў жыцця Аляксандра Каўша, то яны выглядаюць даволі супярэчлівымі і таямнічымі. Паводле пашыранай сярод гісторыкаў версіі, восенню 1941г. святар перабраўся ў Мінск, дзе будзе працаваць у выдавецкім аддзеле мясцовай епархіі. Потым ён атрымае прыход у в.Плешчаніцы Лагойскага раёну, які фактычна адновіць з нуля. Насуперак загаду нямецкай адміністрацыі, айцец Аляксандр таемна хрысціў і вянчаў яўрэяў, рызыкуючы сваім жыццём. За гэта ў 1943г. ён быў арыштаваны гестапа, і, верагодна, расстраляны ў мінскай турме.

Ужо пасля вайны, у асяроддзі беларускай эміграцыі з’явяцца іншыя версіі гібелі А.Каўша. Гісторык Іван Касяк і Святаслаў Коўш, сын святара, выкажуць думку, што прычынай забойства айца Аляксандра быў правакацыйны данос, створаны антыбеларускімі сіламі яшчэ ў Вільне і перададзены немцам. Верагодна, да гэтага даносу прыклаў руку і Р.Астроўскі. Набіраючы ў гэтыя часы папулярнасць сярод акупантаў і беларускіх калабарантаў, ён, верагодна, імкнуўся ліквідаваць на сваім шляху ўсё тое, што звязвала яго з Грамадой ды камунізмам. Яшчэ адзін беларускі дзеяч, Язэп Малецкі, на старонках газеты “Бацькаўшчына” агучыў свой пункт погляду наконт смерці святара. Згодна з ім айцец Аляксандр не быў расстраляны немцамі ў 1943г., а быў забіты літоўскімі паліцыянтамі яшчэ ўвосень 1941г. у в.Ласіцы – месца сваёй ранейшай пастырскай службы. Ва ўсялякім выпадку вядома, што святар загінуў пакутніцкай смерцю, а яе абставіны, мяркуем, безумоўна будуць яшчэ раскрыты.

Сёння ў віленскай Пятніцкай царкве наўрад ці ўспамінаюць пра протаіерэя Аляксандра Каўша, тое ж самае, як і ў гродзенскім Пакроўскім саборы, дзе ён некалі прымаў свой духоўны сан. Але ўпэўнены, што час зробіць сваю справу і памяць пра гэтага вялікага патрыёта і вернага сына Царквы будзе гучаць ва ўсіх абшарах Беларусі.

Аляксандр Горны
гісторык

Церкви-юбиляры

В 2011 году отмечают свой юбилей 4 православных храма, находящиеся в Гродненском районе - 155-лет со дня основания церкви в д.Вертелишки, освященной во имя благоверного князя Александра Невского; 145-лет отмечает церковь в д.Озеры, освященная в честь Святого Духа; 130 лет исполняется Крестовоздвиженской церкви в д.Головачи и Свято-Александро-Невской церкви в д.Индура. Обратимся к истории этих храмов.

Вертелишки


Православная Александро-Невская церковь в д.Вертелишки была построена в 1856 году на территории бывших владений помещицы Свечиной, на месте обветшавшего деревянного храма. Идея о строительстве новой каменной церкви возникла еще в конце 30-х - начале 40-х годов XIX века. Старую деревянную церковь, уже в те годы нуждавшуюся в капитальном ремонте, еще какое-то время поддерживали в рабочем состоянии, постоянно проводя в ней различные восстановительные работы, но это не решало проблем. План будущей церкви в д.Вертелишки был составлен гражданским инженером Яковским и утвержден Гродненским губернским строительным комитетом. Строительные работы начались в мае 1854 года, но еще в мае 1853 года было заготовлено необходимое количество дерева. Постепенно производилась доставка извести, гонта для покрытия крыши и другого строительного материала. Одновременно с этим, в мае 1854 года Гродненский благочинный



о.А.Шеметилло просил Гродненское губернское правление позаботиться и о внутреннем устройстве новосооружаемой церкви, опасаясь задержки в окончательном завершении всех работ по ее благоустройству. И поскольку сроки строительства не были определены, временно, для проведения богослужений, приспособили старую церковь в деревне Козловичи. В Вертелишках в июне 1854 года уже возводились стены храма, а также было положено основание для устройства крыши. К этому времени произвелась полная доставка необходимого материала. Строительные работы ежедневно проводили 40 человек и в июле 1854 года стены храма практически были возведены, полным ходом проходила укладка потолка. В сентябре 1855 года все наружные строительные работы были окончены, а внутри проводилась штукатурка внутренних стен. Десятого февраля 1856 года новопостроенная церковь была освидетельствована специальной комиссией и передана в ведение духовенства.

Озеры

История церкви в д.Озеры начинается в 1864 году. В то время это была небольшая деревянная церковь, которая не могла вместить всех



прихожан, она неоднократно подвергалась ремонту, к ней постоянно пристраивались новые помещения, в том числе и хозяйственные. В 1864 году органами власти было принято решение о строительстве нового каменного здания храма в д.Озеры. В смете расходов к проекту строительства церкви, которая датирована 25 ноября 1864 годом, подробно расписаны все виды работ, проводимые в ходе данного строительства. Среди этих работ можно выделить: земляные, каменные, штукатурные, плотничные, столярные, малярные, печные, стекольные и оптовые. Новый каменный храм с колокольней должен был вместить 450 человек. С 1864 по 1865 годы велись подготовительные работы: выделялись денежные средства, а также закупался строительный материал. Сумму в размере 2.750 рублей серебром выделила Палата государственных имуществ, а наблюдение за ходом работ было поручено председателю Озерского церковного совета, священнику Адаму Михалевичу. В том же 1865 году началось строительство нового православного храма в д. Озеры, которое предварялось освящением закладки фундамента. В отчете о.Адама Михалевича 28 апреля 1865 года отмечается как большое торжество, на которое было приглашено много гостей - представителей духовенства, а также органов власти. По окончании Божественной литургии, все присутствующее духовенство в полном облачении, сопровождаемое членами комитета и многочисленными прихожанами, двинулись Крестным ходом на площадь, где и началось освящение закладки фундамента нового храма. В алтарной части будущего храма был воздвигнут крест, на котором указывалось время закладки. Строительные работы начались уже 4 мая, на первоначальном этапе в нем были задействованы 7 каменщиков и от 18 до 25 чернорабочих из числа прихожан. И уже 21 ноября 1866 года в отчете о. Адама Михалевича говорится, что строительство нового каменного храма в д.Озеры закончено. Всего за 1,5 года строительных работ была израсходована сумма в размере 6.000 рублей.

Индура

Планы строительства новых церквей в д.Индура и д.Головачи рассматривались властями параллельно и утверждались в одних документах в 1879 году. Эти два храма и построены были практически одновременно в 1881 году. Но если строительство Головачской церкви началось сразу после ее утверждения, то Александро-Невский храм в д.Индура ждал своего часа долгих 14 лет. Уже в 1865 году возникла необходимость такого строительства, так как множество населенных



пунктов, входивших в Лашанский приход, располагались на достаточно отдаленном расстоянии от д.Лаша, которая находилась почти на окраине прихода. Сообщение деревень осложнялось еще весенними (а иногда и летними) разливами речки Лашанки. Группировались эти населенные пунк-

ты около д.Индура и по преданию именно здесь ранее и находилась православная церковь. Толчком к практическим действиям послужило прошение крестьян Индурского сельского общества епископу Брестскому Игнатию по вопросу строительства нового храма. Епископ Игнатий, в своем письме от 12 октября 1865 года Гродненскому губернскому временному комитету по устройству православных церквей указывал на необходимость такого строительства и, соответственно, на целесообразность образования нового Индурского прихода. Начался сбор пожертвований на строительство нового храма, причем помощь в этом деле оказывали люди различных сословий. Так, например, крестьяне близлежащих деревень собрали в итоге 682 рубля 48 копеек, а помещики Гродненского уезда - Козловский, Пусловский, Немцевич и де-Лясси жертвовали под строительство церкви свои земли. Начало строительства затягивалось и 20 апреля 1877 года, член Литовской духовной консистории протоиерей Петр Левицкий обратился с письмом в Гродненское губернское церковно-строительное присутствие с просьбой о скорейшей передаче земельного участка под строительство Индурского храма. В октябре 1878 года был образован Временный хозяйственно-строительный комитет, на который и возлагалось строительство нового каменного храма в д. Индура. Основные денежные средства выделило Министерство внутренних дел и смета расходов, по предварительным данным, составляла 13.498 рублей 55 копеек (впоследствии сумма составляла 15.433 рубля 1 копейка). Кроме того на покупку колоколов и церковной утвари правительством выделялась сумма в размере 1.631 руб. 47 копеек, Гродненским церковно-строительным присутствием было выделено 1.631 руб. 47 копеек. Колокола и церковная утварь закупались в г. Гродно в лавке купца Мухина. Доставка строительного материала: булыжного камня, песка и воды, а также поставка чернорабочей силы возлагалось на местное население. Проект, план местности, а также смета расходов новостроящейся церкви были представлены в Гродненское губернское церковно-строительное присутствие 3 октября 1878 года. Проект утвердило Строительное отделение Гродненского губернского правления 3 марта 1879 года. Согласно плану, будущий храм должен был вмещать в своих стенах 550 человек молящихся. К строительным работам приступили 1 сентября 1879 года и в ноябре того же года каменный фундамент храма был заложен. Постройку нового храма завершили достаточно быстро - 29 сентября 1881 года. Все строительные работы к этому времени были окончены и 11 ноября того же года новопостроенный храм освидетельствовала специально созданная для этого комиссия. Состоялась передача его в Духовное ведомство. В работе, правда, был один недостаток - из-за материальных трудностей церковный иконостас не был закончен в срок, его сдача произошла только в октябре 1882 года.



Головачи

Строительство новой каменной церкви в д.Головачи началось в 1879 году. Будущий храм должен был находиться в центре населенного пункта и недалеко от старой, уже совершенно обветшавшей церкви. К 30 ноября 1878 года Временным строительным комитетом был представлен проект новой церкви, план местности, а также смета расходов на постройку, составленные губернским архитектором И.Каленкевичем, который должен был вести наблюдение за строительными работами. Исходя из данного проекта, вместительность храма рассчитывалась на 550 человек молящихся, как и Индурский храм. Окончательно план церкви, а также смета расходов, составлявшая 13.407.67 рублей, были утверждены 3 марта 1879 года Строительным отделением Гродненского губернского правления. Строительные работы начались 10 сентября 1879 года, причем все строительные материалы: камень, песок, глину, воду - также бесплатно доставляли прихожане близлежащих деревень. Крестьяне деревень Головачи, Залесяны, Конюхи, Бобровня, Тарасюки, Бубны, Приступичи, Беляковщина и другие, приняли на себя обязательства по доставке строительных материалов к месту строительства. Все строительные работы окончательно завершились 5 ноября 1881 года. А 26 ноября 1881 года здание нового каменного храма было передано по инвентарной описи в Духовное ведомство. По освидетельствовании новопостроенной церкви членами комиссии, отмечалось, что все работы произведены согласно утвержденному проекту и смете, выполнены прочно, из хорошего, добротного материала. Новую церковь освятили в честь Воздвижения Креста Господня.

Старший научный сотрудник
ГУ «Национальный исторический архив Беларуси в г.Гродно»
М.А.Сиверцева

Дорогие братья и сестры!

По благословению Преосвященнейшего Артемия, епископа Гродненского и Волковысского, **в микрорайоне «Девятовка» г.Гродно ведется строительство нового храма в честь Рождества Христова.**

Всем, кто желает вложить свою лепту в это богоугодное дело, просьба обращаться к иерею Владимиру Асадчему.

Подробности по телефону:
8-029-784-55-14

●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●

Дорогие братья и сестры!

По благословению Преосвященнейшего Артемия, епископа Гродненского и Волковысского, в микрорайоне «Зарица-1» г.Гродно ведется **строительство нового храма в честь преподобномученика Афанасия Брестского**. Все желающие вложить свою лепту в это богоугодное и спасительное дело могут обращаться к **иерею Вячеславу Гапличнику**, клирику Свято-Покровского кафедрального собора г.Гродно по телефону:

Мобильный: 8-029-789-23-05
Домашний: 56-67-45

●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●●

“Гродненские епархиальные ведомости” издаются по благословению Преосвященнейшего Артемия, епископа Гродненского и Волковысского

Учредитель:
Гродненская епархия

Главный редактор:
Шурский Александр Владимирович

Редколлегия:
протоиерей Анатолий Ненартович
протоиерей Александр Велисейчик
протоиерей Александр Железный
протоиерей Александр Хомбак
иерей Иоанн Велисейчик
иерей Владимир Борисевич
протодиакон Иоанн Авсиевич

Газета зарегистрирована Министерством Информации Республики Беларусь
Регистрационное свидетельство №1358 от 30 апреля 2010г.

Издается ежемесячно
на русском и белорусском языках
Объем - 2,5 усл. печ. листа
Тираж 1100 экз.

Адрес: 230023, г.Гродно, ул. Горького, 2
Адрес для писем:
230023, г.Гродно, ул.Ожешко, 23,
Епархиальное управление
(для редакции)
Тел. (8-0152) 77-06-86
факс (8-0152) 72-01-93

Наш адрес в Интернете:
http://www.orthos.org
E-mail: gev@prihod.info

Подписной индекс 63609
Для предприятий и организаций 636092
Цена договорная

Газета набрана и сверстана в редакции “ГЕВ” Гродненской епархии.
Отпечатано в ГОУПП “Гродненская типография”
230025, г. Гродно, ул.Полиграфистов, 4.
ЛП №02330/0552745
от 25 февраля 2009 года

Сдана в набор 21.10.2011
Подписана в печать (14:21) 28.10.2011
Подписана в свет 28.10.2011

№11 2011г.
Заказ **6266**